УДК 947.6.«1917»

**І. М. Рыжанкоў**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА СЯЛЯНСТВА (САКАВІК – МАЙ 1917 Г.)

У артыкуле асвятляюцца мерапрыемствы Часовага ўрада па палітычнай мадэрнізацыі дзяржавы і жыццядзейнасць беларускага сялянства. Перамога Лютаўскай рэвалюцыі абумовіла складанне новай палітычнай сістэмы расійскага грамадства. Важнай прыкметай дэмакратызаванай дзяржавы сталі партыі і грамадскія арганізацыі, якія па разнастайнасці, вялікай колькасці і масавасці сведчылі пра наяўнасць злабадзённых, нявырашаных праблем і імкненне грамадскасці вырашаць наспелыя пытанні праз дэмакратычныя інстытуты. Урадавыя, грамадска-палітычныя структуры своечасова прыступілі да гэтай працы і на працягу свайго існавання не спынялі яе. Мелася агульнаграмадская патрэба ва ўсталяванні новага ладу: ліквідацыя рудыментаў старога ладу, маральная і практычная дапамога Часоваму ўраду і яго мясцовым органам, неабходнасць вырашэння дзяржаўных і грамадскіх праблем, абвостраных працяглай і разбуральнай вайной, у тым ліку эканамічных, палітычных, сацыяльных, нацыянальных, наяўнасць шырокай сацыяльнай базы змагароў супраць самадзяржаўя. Актывізацыя грамадска-палітычнага жыцця спрыяла паляпшэнню палітычнай асветы вяскоўцаў, але часам прыводзіла да не чаканых для арганізатараў вынікаў.

**Ключавыя словы:** рэвалюцыя, палітычная мадэрнізацыя, рэформы, Часовы ўрад.

**Для цытавання:** Рыжанкоў І. М. Грамадска-палітычныя арганізацыі і жыццядзейнасць беларускага сялянства (сакавік – май 1917 г.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2023. № 2 (275). С. 37–40. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-275-2-6.

**I. M. Ryzhankou**
Belarusian State Technological University

# SOCIO-POLITICAL ORGANIZATIONS AND THE VITAL ACTIVITY OF THE BELARUSIAN PEASANTRY (MARCH – MAY 1917)

The article highlights the activities of the Provisional Government on the political modernization of the state and the vital activity of the Belarusian peasantry. The victory of the February Revolution caused the formation of a new political system of Russian society. An important sign of a democratized state were parties and public organizations, which, by their diversity, large number and mass character, testified to the presence of topical, unresolved problems and the desire of the public to solve urgent issues through democratic institutions. Governmental, socio-political structures started this work in time and have not stopped it throughout their existence. There was a general social need to establish a new system: the elimination of the rudiments of the old system, moral and practical assistance to the Provisional Government and its local bodies, the need to solve state and public problems exacerbated by a long and destructive war, including economic, political, social, national, the presence of an extensive social base of fighters against autocracy. The activation of socio-political life contributed to the improvement of the political education of the villagers, but sometimes led to results not expected for the organizers.

**Keywords:** revolution, political modernization, reforms, Provisional Government.

**For citation:** Ryzhankou I. M. Socio-political organizations and the vital activity of the belarusian peasantry (March – May 1917). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2023, no. 2 (275), pp. 37–40. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-275-2-6 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Перамога Лютаўскай рэвалюцыі абумовіла выспяванне новай палітычнай сістэмы Расіі. Акрамя дэмакратызаванай дзяржавы, яе найважнейшымі элементамі сталі партыі і грамадскія арганізацыі. Іх разнастайнасць, вялікая колькасць і масавасць сведчылі пра наяўнасць злабадзённых (эканамічных, палітычных і інш.) праблем, якія існавалі ў краіне, пра спадзяванне ўдзельнікаў адзначаных арганізацый на магчымасць дасягнення мірным, дэмакратычным шляхам сваіх (карпаратыўных, класавых, нацыянальных і інш.) мэт.

**Асноўная частка.** Рэвалюцыйныя падзеі, якія ахапілі Петраград, напачатку мала цікавілі вяскоўцаў прыфрантавых беларускіх губерняў. Вопыт папярэдняй рэвалюцыі 1905–1907 гг. нагадваў, што паслабленне ўлады можа спрыяць процiпраўным сялянскім акцыям. Невыпадкова

адразу пасля звяржэння самаўладдзя з мэтай іх прадухілення ва ўрадавых і грамадскіх колах у ліку першых узнікла задача «арганізацыі вёскі», г. зн. шырокай тлумачальнай працы сярод сялян. Масавыя агітацыйна-прапагандысцкія мерапрыемствы адбываліся ў межах валасных таварыстваў і скіроўваліся на перакананне ў неабходнасці падпарадкоўвацца Часоваму ўраду, а таксама неаслабнай дапамогі арміі.

Пэўны непакой ваеннага галоўнакамандавання і ўладных структур выклікала праблема сялянскіх паставак сельгаспрадуктаў. Было відавочна, што старая сістэма нарыхтоўкі зрабілася непрымальнай, а новая магла ажыццяўляцца толькі з улікам добрай волі саміх хлебаробаў. Сфарміраваць і здзяйсняць гэтую «добрую волю» на мясцовым, тым больш – усерасійскім узроўні было магчыма толькі з дапамогай такой жа маштабнай і ўплывовай грамадскай арганізацыі, якая б цесна супрацоўнічала з уладнымі структурамі. Невыпадкова ў арганізаваным агульнадзяржаўным Харчовым камітэце найбольшая колькасць месцаў (па 5 з 37) адводзілася прадстаўнікам Савета сялянскіх і Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Варта заўважыць, што напярэдзе было ўтварэнне Усерасійскага сялянскага Савета, які з'яўляўся агульнадзяржаўнай патрэбай.

Каб аб'яднаць сялянскую грамаду для працы на агульную карысць, новая палітычная эліта мусіла прыкласці сілы да працяглай агітацыйна-прапагандысцкай працы на вёсцы з мэтай яе арганізацыі ў маштабах усёй краіны. Натуральна, што ва ўмовах надання ўсім сялянам роўных з астатнімі грамадзянамі свабод і правоў, а таксама ў адпаведнасці з абвешчанымі 3 сакавіка ў Дэкларацыі Часовага ўрада прынцыпамі, дарэвалюцыйныя формы кіравання вёскай, заснаваныя пераважна на страху перад пакараннем, паступова гублялі сваю сілу.

Палітычны сэнс адмовы ад гэтых форм кіравання заключаўся, акрамя іншага, і ў тым, што селянін павінен быў адчуць перавагу новай сістэмы ўлады перад царызмам і прыйсці ёй на дапамогу па добрай волі; таксама, асэнсаваць уласнае месца і ролю ў бягучым жыцці, сувязь з усім грамадствам. Невыпадкова, першыя адозвы да сялянства, скіраваныя на прадухіленне яго ўдзелу ў захопах панскай маёмасці, былі пазбаўлены дырэктыўных акцэнтаў, а апелявалі да такіх катэгорый, як неабходнасць, справядлівасць, парадак і г. д. [1].

Агульным вынікам тлумачальна-прапагандысцкай дзейнасці на вёсцы ўсіх урадавых, грамадскіх і іншых работнікаў у першыя тыдні рэвалюцыі 1917 г. стала лакалізацыя і перапыненне сялянскіх захопаў панскай, дзяржаўнай і інш. маёмасці. Але на пачатковым этапе станаўлення дэмакратычнага ладу сялянства яшчэ заставалася пасіўнай у палітычных адносінах масай. Між тым буржуазна-дэмакратычны, па ацэнках сацыял-дэмакратаў, ці нават народны, з пункту гледжання эсэраў, характар рэвалюцыі вымагаў свядомага і масавага ўдзелу ва ўмацаванні новага ладу. У прыватнасці, задачы ўсебаковага (палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, духоўнага) рэфармавання грамадства і дзяржавы настойліва патрабавалі ўцягнення ў гэты працэс сялянства, прычым не толькі ў якасці аб'екта, але і суб'екта рэвалюцыйнага абнаўлення. Ініцыятыва мясцовых дзеячаў па прапагандзе на вёсцы новага ладу атрымала моцную падтрымку з боку Усерасійскага Сялянскага саюза, які пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі распачаў згуртаванне расійскага сялянства, у тым ліку і беларускага, у мэтах справядлівага вырашэння аграрнага пытання. Пры гэтым дасягненне адзначанай мэты ставілася ў залежнасць ад умацавання новага ладу. Створаны Галоўны камітэт гэтай арганізацыі (старшыня С. Мазурэнка) у адозве ад 15 сакавіка заклікаў сялянства падтрымаць Новы урад, яго камісараў і ўсе грамадскія арганізацыі. У «Вестніку Мінскага губернскага камісара» ад 19 сакавіка 2023 г. адзначалася, ні ў якім разе не дапускаць «самаўпраўства і замахаў на чужую ўласнасць і свабоду». З гэтай мэтай сяляне, у тым ліку беззямельныя, мужчыны і жанчыны, заклікаліся да абрання «валасных саветаў» для ўладкавання «на вёсцы новага жыцця і ўсталявання паўсюдна свабоды, роўнасці і братэрства». Упершыню паведамлялася аб перспектывах аграрнай рэформы, калі «ва Устаноўчым сходзе сялянства ліквідуе векавечную несправядлівасць у размеркаванні зямлі і знойдзе спосабы надзяліць зямлёю кожнага, хто жадае яе апрацоўваць». 19 сакавіка 1917 г. адозва з'явілася ў мінскіх «Известиях Совета рабочих и солдатских депутатов», 6 красавіка – у «Минском голосе», 20 – у «Голосе Полесья» (Рэчыца). Сялянскі саюз не толькі заклікаў да падтрымкі новага ладу, але і стаў на платформу абаронцы класавых інтарэсаў працоўных вёскі. Ініцыятарамі заснавання сялянскіх арганізацый, у дадзеным выпадку – суполак Сялянскага саюза на Беларусі, з'яўляліся асобы з ліку земскіх, урадавых і іншых работнікаў. Афармленне арганізацый адбывалася на сходах з удзелам сельскіх і валасных упаўнаважаных. У сярэдзіне сакавіка ў Гомелі адбыўся сход 700 валасных дэлегатаў, на якім была ўтворана адна з першых на Беларусі суполак Сялянскага саюза пад старшынствам прысяжнага паверанага Гаравога Я. Я.

У большасці месц Беларусі ўтварэнне суполак Сялянскага саюза пачыналася «зверху», г. зн. з утварэння губернскага цэнтра. На Міншчыне гэтая праца пачалася 22 сакавіка з удзелам

сялянскіх дэлегатаў ад Бабруйскага, Барысаўскага, Ігуменскага, Мазырскага, Мінскага, Навагрудскага, Пінскага і Рэчыцкага паветаў, запрошаных у Мінск, і завяршылася назаўтра стварэннем губернскага камітэта пад старшынствам М. А. Міхайлава (Фрунзе). Камітэт вызначыў сваёй задачай «умацаванне на вёсцы асноў новага ладу і арганізацыю працоўнага сялянства» і заняўся скліканнем губернскага сялянскага з'езда. Пачатак быў адтэрмінаваны з-за падзеі ўсерасійскага маштабу – з'езда салдацкіх і рабочых дэпутатаў Заходняга фронту, які таксама прызнаў неабходнасць арганізацыі сялянства і нават пакінуў яго прадстаўнікам у Франтавым камітэце 5 месцаў з 75.

Вынікі адзначанага з'езда мусілі спрыяць умацаванню сувязяў паміж фронтам і тылам і згуртаванню грамадства вакол Часовага ўрада ў ажыццяўленні яго ўнутранай і знешняй палітыкі. Падобныя агульнапалітычныя пытанні былі вынесены на абмеркаванне з'езда сялянскіх дэлегатаў Мінскай і Віленскай губерняў, які адбыўся ў Мінску 20–23 красавіка пад старшынствам М. В. Фрунзе з удзелам амаль 800 чалавек, у тым ліку прадстаўнікоў губернскіх улад, грамадска-палітычных і партыйных арганізацый.

Палітычная (супраць пастаноў Беларускага нацыяльнага камітэта аб перспектывах нацыянальна-дзяржаўнага развіцця тутэйшага рэгіёна) настроенасць арганізатараў з'езда абумовіла адпаведныя паводзіны дэлегатаў-сялян, якія ў прапанаванай ім рэзалюцыі выказаліся супраць аўтаноміі края, беларускай школы. Астатнія пытанні разглядаліся ў рэчышчы пастаноў Франтавога з'езда. У галіне культуры і асветы вёскі дэпутаты выказаліся за адкрыццё народных дамоў, увядзенне ўсеагульнай, абавязковай і бясплатнай адукацыі, скасаванне царкоўна-прыходскіх і касцёльных школ, выданне «Крестьянской газеты».

Удзельнікі з'езда абралі Выканкам Савета сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў у складзе 20 чалавек пад старшынствам М. В. Фрунзе, а таксама дэлегацыю ў складзе старшыні выканкама, таварыша Курскова, дэпутатаў – Караткевіча (ад Бабруйскага), Зарэмбы (Барысаўскага), Лебедзя (Слуцкага), Ліпскага (Мазырскага), Маронкі (Ігуменскага), Рагожына (Пінскага), Рагулі (Навагрудскага), Рудневіча (Ашмянскага), Сыса (Рэчыцкага), Шостака (Мінскага) паветаў на Усерасійскі сялянскі з'езд [2, с. 519]. Пастановы адзначанага з'езда, акрамя іншага, стымулявалі ўтварэнне павятовых сялянскіх арганізацый. У Мазыры пры садзеянні Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў быў створаны арганізацыйны камітэт Сялянскага саюза (старшыня П. П. Максімаў), а затым, 29 красавіка, на з'ездзе сялянскіх дэпутатаў адбылося афармленне яго павятовага камітэта. У красавіку суполкі саюза былі створаны таксама ў Ігуменскім і Рэчыцкім паветах Да ліпеня сялянскія Саветы і суполкі саюза ўтварыліся ў астатніх паветах. Справе іх арганізацыі і далейшай дзейнасці паспрыяў выхад «Крестьянской газеты».

У першыя месяцы рэвалюцыі ў Беларусі адбывалася ўтварэнне губернскіх, павятовых і шэрагу валасных сялянскіх Саветаў. Вызначальную ролю ў іх далейшай дзейнасці адыгрывалі пастановы Усерасійскага з'езда сялянскіх дэпутатаў, прынятыя з удзелам 74 дэлегатаў беларускіх губерняў (Каранькоў (Магілёў), Г. Трызна (Чыгірынская вол., Быхаўскі пав.), А. І. Аношка (Кошалеўская вол., Рагачоўскі пав.), Т. Г. Пенязькоў (Гомель)). У склад яго Выканаўчага камітэта, былі абраны лідэры сялянскіх Саветаў: М. Б. Гольман, П. М. Караткевіч (Бабруйск), А. Я. Кусэ-Цюз (Віцебск), С. М. Малышчыцкі (Гомель) А. І. Аношка (Рагачоў), Е. Мар'янкоў (Быхаў), Дз. М. Васілеўскі (Полацк), Ц. Х. Тарасаў (Клімавічы) [3, л. 351].

Другім найважнейшым наступствам утварэння сялянскіх арганізацый стала паўсюднае інтэграванне іх прадстаўнікоў у дзяржаўныя (камісарыяты, харчовыя і зямельныя камітэты) і грамадскія структуры. Так, Сялянскі саюз Мінскай і Віленскай губерняў накіраваў 5 прадстаўнікоў у губернскі, 3 – гарадскі, 2 – павятовы харчовы камітэты, а таксама 5 – у Франтавы камітэт. 7 мая на Ігуменскім сялянскім з'ездзе была выказана нязгода з тым, што ў склад харчовага камітэта былі вылучаны прадстаўнікі валасных выканаўчых камітэтаў. «Не лічучы іх "прадстаўнікамі сялянства і абаронцамі інтарэсаў працоўнага народа", дэлегаты абралі ў яго прадстаўнікоў ад Сялянскага саюза – І. Лазовіка, І. Міралевіча, Т. Тузіна» [2, с. 282]. Адным з праяў аўтарытэту эсэраўскай партыі і яе аграрнай праграмы сталі адпаведныя рэзалюцыі губернскіх з'ездаў сялян Беларусі. Такім чынам, да восені 1917 г. у неакупіраванай Беларусі ўзнікла і дзейнічала сетка (без уліку «рэвалюцыйных камітэтаў» і суполак Сялянскага саюза) сялянскіх Саветаў, у тым ліку 4 губернскія (Мінска-Віленскі, Віцебскі, Магілёўскі, Віленска-Ковенскі), 33 павятовыя.

Дакладная колькасць валасных Саветаў не ўстаноўлена. Першыя сталі ўзнікаць яшчэ ў маі – Бярозаўскі Мазырскага павета, а апошні – Нацкі Лепельскага павета, пачаў сваю працу ў пачатку кастрычніка.

**Заключэнне.** У сакавіку 1917 г. усталяваны ў дзяржаве дэмакратычны рэжым мусіў забяспечыць усім сацыяльным пластам, нават салдатам дзеючай арміі, палітычныя правы і свабоды, у тым ліку права на ўтварэнне грамадска-палітычных арганізацый. Іх узнікненне падмацоўвалася

неабходнасцю недапушчэння вяртання самадзяржаўя.

Нарэшце, вопыт рэвалюцыйнай барацьбы паспрыяў узнікненню моцных сацыяльных рухаў, якія прывялі да арганізацыі камітэтаў бяспекі, Саветаў, прафсаюзаў і інш. Актывізацыя грамадска-палітычнага жыцця спрыяла паляпшэнню палітычнай асветы вяскоўцаў, але часам прыводзіла да нечаканых для арганізатараў вынікаў – учынення гвалту да валасной адміністрацыі, захопу і падзелу зямлі, высечкі лесу. Аграрны рух не набыў вялікіх разбуральных памераў і знаходзіўся пад кантролем грамадска-палітычных і ўрадавых сіл.

## Спіс літаратуры

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 624. Воп. 1. Спр. 4. Л. 18–19.

2. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. В 2 т. / редкол.: Г. С. Горбунов [и др.]. Белоруссия в период подготовки социалистической революции (февраль – октябрь 1917 г.). Минск: Госиздат БССР, 1957. Т. 1. 1008 с.

3. НАРБ. Фонд 863. Воп. 1. Спр. 2. Л. 351.

## References

1. National Archives of the Republic of Belarus (NARB). Fund 624. I. 1. F. 4. P. 18–19.

2. *Velikaya Oktyabr'skaya sotsialisticheskaya revolyutsiya v Belorussii. Dokumenty i materialy. V 2 t. T. 1. Belorussiya v period podgotovki sotsialisticheskoy revolyutsii (fevral' – oktyabr' 1917 g.)* [The Great October Socialist Revolution in Belarus. Documents and materials. In 2 vol. Vol. 1. Belarus in the period of preparation for the socialist revolution (February – October 1917)]. Ed. board: G. S. Gorbunov [et al.]. Minsk, Gosizdat BSSR Publ., 1957. 1008 p. (In Russian).

3. NARB. Fund 863. I. 1. F. 2. P. 351.

## Інфармацыя пра аўтара

**Рыжанкоў Ігар Міхайлавіч** − кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: im@belstu.by

## Information about the author

**Ryzhankou Ihar Mikhaylavich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: im@belstu.by

*Паступіў 11.09.2023*